# Творы, сабраныя з беларускіх шляхоў



**З 29 студзеня ў зале дакументаў па мастацтве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі праходзіць кніжна-ілюстрацыйная выстава «Пра мінулае і адвечнае», прысвечаная 75-годдзю вядомага мастака, уладальніка дыплома і медаля Францыска Скарыны Міколы Купавы.**

Адзін з прадстаўнікоў беларускага Адраджэння, руплівы збіральнік і захавальнік гістарычных помнікаў нашай краіны, каштоўнасцяў мінулага, з якім непарыўна звязаная будучыня, Мікола Купава – чалавек, які шчыра і аддана, па-сапраўднаму любіць нашу невычэрпную культурную спадчыну і родную мову, перажывае за развіццё нацыянальнай школы ў мастацтве. Ён перакананы, што беларуская культура – гэта вялікі мацярык са шматлікімі скарбамі.

Мікалай Мікалаевіч нарадзіўся ў Оршы, прафесійную адукацыю атрымаў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце, дзе вучыўся ў П. Любамудрава, В. Шаранговіча. Працуе ў галіне кніжнай і станковай графікі, акварэлі, жывапісу, гістарычнай кампазіцыі, экслібрыса. Ён выканаў мастацкае аздабленне звыш 30-і кніг і альбомаў, стварыў галерэю партрэтаў слынных дзеячаў беларускай гісторыі і культуры, адлюстраваў вобразы спрадвечных помнікаў прыроды, цудоўныя беларускія краявіды. З 1972 г. М. Купава вядзе актыўную выставачную дзейнасць.

На выставе экспануюцца рэпрадукцыі твораў М. Купавы, прысвечаныя галоўным тэмам яго творчасці, – пісьменнікам Янку Купалу і Якубу Коласу, розным перыядам іх жыцця, звязаным з імі мясцінам. Напрыклад, прадстаўленыя копіі лінарытаў з альбома «Шляхамі Янкі Купалы». Прыцягнуць увагу наведнікаў рэпрадукцыі да твораў Цёткі, а таксама шэраг кніг з ілюстрацыямі Купавы: «На шырокі прастор» С. Александровіча, «Браткі» Д. Бічэль-Загнетавай, "Той курган векавечны..." К. Цвіркі, «Судны дзень Скарыны» М. Арочкі, «Фрэскі» С. Тарасава, альбом «Францішак Бенядзікт Багушэвіч», беларускія народныя казкі і іншыя выданні.

Дапаўняюць выставу публікацыі пра М. Купаву, інтэрв'ю з ім, а таксама яго артыкулы, кнігі і каталогі выставаў, укладальнікам якіх быў мастак.

Варта дадаць, што цягам доўгага часу Мікалай Мікалаевіч з'яўляецца чытачом НББ, яго ведаюць і паважаюць супрацоўнікі, а ў кніжных фондах бібліятэкі нямала выданняў з цудоўнымі ілюстрацыямі М. Купавы. Графік прымае актыўны ўдзел у мастацкіх выставах бібліятэкі. Так, яго экслібрысы прадстаўленыя ў экспазіцыі музея кнігі «З кніг Уладзіміра Караткевіча», а на выставе «Княства вобразаў і слоў» экспануюцца акварэлі М. Купавы да казак У. Караткевіча. Удзельнічае Мікалай Мікалаевіч і ў выдавецкіх праектах бібліятэкі: ён аказаў значную дапамогу ў афармленні электроннага дыска «"Не пакідайце ж мовы нашай беларускай": да 180-годдзя Ф. Багушэвіча», яго творы часткова ўпрыгожваюць вокладку і ўнутраны інтэрфейс гэтага выдання.

Пабачыць выставу, прысвечаную выбітнаму мастаку, можна па 28 лютага.

***Паводле паведамлення НББ***

**ГА «Беларускі фонд культуры» і «Краязнаўчая газета» шчыра віншуюць Міколу КУПАВУ з паважным юбілеем. Зычым моцнага здароўя і плёну, новых уласных працаў і знаходак у галіне мастацкай спадчыны краіны.**